# *§ 40–0. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыя БССР

**ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА**
**«НОВЫ ПАРАДАК»**
**ПЛАН «ОСТ» ГЕНАЦЫД ГЕТА**
**ХАЛАКОСТ ОСТАРБАЙТАРЫ**
**ЛАГЕРЫ СМЕРЦІ**
**КАРНЫЯ АПЕРАЦЫІ**
**КАЛАБАРАЦЫЯНІЗМ**

**1. Абарончыя баі на тэрыторыі БССР і іх значэнне.** Вялікая Айчынная вайна была надзвычай цяжкім выпрабаваннем для беларускага народа. Улетку 1941 г. на тэрыторыі Беларусі наступала самая магутная група нямецкіх армій — «Цэнтр». Асноўнымі яе задачамі з'яўляліся разгром часцей Чырвонай арміі на тэрыторыі БССР і стварэнне ўмоў для наступу на Маскву. Групе армій «Цэнтр» супрацьстаялі войскі Заходняй Асобай ваеннай акругі (ад 22 чэрвеня 1941 г. — Заходняга фронту), камандуючы — генерал арміі Д. Г. Паўлаў.

Першымі на дзяржаўнай мяжы СССР прынялі ўдар вермахта памежнікі. Яны мужна баранілі давераныя ім участкі дзяржаўнай мяжы. Баі працягваліся ад некалькіх гадзін да некалькіх сутак.

Ад **22 чэрвеня** да **канца ліпеня 1941 г.** стойка змагаўся гарнізон Брэсцкай крэпасці. Пра стойкасць воінаў сведчаць надпісы на сценах крэпасці: «Памром, але з крэпасці не сыдзем», «Я паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма!».




*Надпіс на сцяне аднаго з казематаў Брэсцкай крэпасці*

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

## ІХ ІМЁНЫ НОСЯЦЬ ПАМЕЖНЫЯ ЗАСТАВЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ




***В. М. Усаў***
*(1916–1941)*
*Герой Савецкага Саюза. Начальнік 3-й памежнай заставы Аўгустоўскага памежнага атрада*



***А. М. Сівачоў***
*(1918–1941)*
*Начальнік 1-й памежнай заставы Аўгустоўскага памежнага атрада*



***Ф. П. Кірычэнка***
*(1908–1941)*
*Начальнік 4-й памежнай заставы Аўгустоўскага памежнага атрада*



***А. М. Кіжаватаў***
*(1907–1941)*
*Герой Савецкага Саюза. Начальнік 9-й памежнай заставы Брэсцкага памежнага атрада*

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія подзвігі здзейснілі героі-памежнікі ўлетку 1941 г. Якія памежныя заставы Рэспублікі Беларусь носяць імёны герояў-памежнікаў? Дзе яны размешчаны?*
2. *Якія каштоўнасці памежнікаў — герояў Вялікай Айчыннай вайны знайшлі працяг у традыцыях і каштоўнасцях сучасных беларускіх памежнікаў?*

### Абарончыя баі на тэрыторыі БССР

Аднак войскі Заходняга фронту не здолелі затрымаць праціўніка ў прыгранічнай паласе. Да канца 25 чэрвеня танкавыя злучэнні групы армій «Цэнтр» прасунуліся ўглыб БССР да 200 кіламетраў. **28 чэрвеня 1941 г.** быў узяты Мінск.

Актыўны адпор праціўніку пад Мінскам давала 100-я дывізія пад камандаваннем генерал-маёра І. М. Русіянава. Ва ўмовах адсутнасці супрацьтанкавых гармат упершыню ў барацьбе супраць варожых



Мемарыяльны комплекс «Загінулым, але не пераможаным воінам-памежнікам Беларускай памежнай акругі» адкрыты ў г. Гродна. Цэнтральная кампазіцыя мемарыяла — «Мяжа ў агні». 15 памежных слупоў сімвалізуюць удзел у абароне мяжы байцоў з усіх саюзных рэспублік

танкаў былі выкарыстаныя бутэлькі з гаручай сумессю. Але пасля трох сутак жорсткага бою дывізія мусіла пакінуць пазіцыі.

У ліпені — жніўні 1941 г. ішлі цяжкія абарончыя баі ў раёне Бабруйска, Барысава, Сянно, Лепеля, Оршы, Гомеля, Магілёва. **6 ліпеня 1941 г.** адбылася адна з найбуйнейшых танкавых бітваў пачатку Вялікай Айчыннай вайны — «Лепельскі контрудар». З абодвух бакоў удзельнічала каля 1600 танкаў. Гітлераўскія войскі панеслі значныя страты, быў запаволены тэмп іх прасоўвання на ўсход. Толькі 11 ліпеня 1941 г. немцы здолелі захапіць Віцебск.

Ад **3** да **26 ліпеня 1941 г.** працягвалася абарона Магілёва. Напружаныя баі тут вяла 172-я стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра М. Ц. Раманава. У раёне в. Буйнічы германскія войскі сустрэлі эфектыўную агнявую абарону савецкіх артылерыстаў, танкістаў і пехацінцаў, а таксама мінныя палі. Абарона Магілёва адыграла важную ролю ў запаволенні тэмпаў наступу вермахта і спрыяла зрыву германскага плана «маланкавай вайны».

Баі пад Оршай сталі вядомыя дзякуючы не толькі стойкасці байцоў Чырвонай арміі, але і магутнаму ўдару батарэі рэактыўнай артылерыі

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ўлетку 1941 г.**




1. *З дапамогай гістарычнай картасхемы і тэксту вучэбнага дапаможніка складзіце храналагічную табліцу «Абарончыя баі на тэрыторыі БССР улетку 1941 г.».*
2. *Успомніце, што такое «бліцкрыг». Дакажыце, што падчас баёў на тэрыторыі БССР гэты план нацысцкай Германіі пацярпеў крах.*



„Я не быў салдатам, быў усяго толькі карэспандэнтам, аднак я маю кавалачак зямлі, які мне век не забыць, — поле пад Магілёвам, дзе я ўпершыню ў ліпені 1941 года бачыў, як нашы на працягу аднаго дня падбілі і спалілі 39 нямецкіх танкаў...“.

К. Сіманаў, франтавы карэспандэнт, савецкі пісьменнік

(«Кацюша»), якая ўпершыню была выкарыстана падчас абстрэлу варожых эшалонаў на чыгуначным вузле горада **14 ліпеня 1941 г.**

У ліпені — жніўні 1941 г. на р. Дняпро ў раёне Рагачова і Жлобіна германскія войскі былі вымушаны на працягу тыдня весці абарончыя баі.

Нягледзячы на гераізм, самаадданасць і велізарныя ахвяры, што зазнала Чырвоная армія ў абарончых баях на тэрыторыі БССР, стрымаць напор ворага не атрымалася. Да канца лета 1941 г. уся тэрыторыя БССР была акупаваная германскімі войскамі.

### Значэнне абарончых баёў на тэрыторыі БССР

Тым не менш сваім упартым супраціўленнем на тэрыторыі Беларусі Чырвоная армія нанесла адчувальную шкоду галоўнай групоўцы вермахта — групе армій «Цэнтр» — і запаволіла тэмпы яе наступу на Маскву. Нямецкі бліцкрыг улетку 1941 г. пацярпеў крах.



Дзмітрый Карбышаў (1880–1945). Генерал-лейтэнант інжынерных войскаў. Трапіў у палон у жніўні 1941 г. пад Магілёвам. Адмовіўся супрацоўнічаць з немцамі. Пакараны смерцю ў канцлагеры Маўтхаўзен 18 лютага 1945 г.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, як загінуў Д. Карбышаў.*
2. *Як вы лічыце, чаму савецкія людзі нават пад страхам смерці адмаўляліся супрацоўнічаць з ворагам?*

Успомніце, што такое акупацыя.

**2. Насельніцтва Беларусі ва ўмовах акупацыі. Генацыд беларускага народа.** Для рэалізацыі сваёй захопніцкай палітыкі нацысты падзялілі акупаваную тэрыторыю БССР на 5 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

Палітыка генацыду

Успомніце, якія планы нацысцкая Германія будавала адносна беларусаў. Якімі дакументамі яны рэгламентаваліся?

На акупаванай тэрыторыі Беларусі нацысты праводзілі мэтанакіраваную палітыку *генацыду беларускага народа*. Яна прадугледжвала поўнае або частковае знішчэнне груп насельніцтва па расавых, нацыянальных, этнічных, палітычных або рэлігійных прыкметах. Вынікам гэтай палітыкі на тэрыторыі Беларусі было знішчэнне больш чым 3 млн чалавек.

Нацысты стварылі сістэму месцаў прымусовага ўтрымання і вынішчэння грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных — *лагераў смерці*. Усяго на акупаванай ворагам тэрыторыі Беларусі было больш за 580 лагераў смерці. Паводле далёка не поўных звестак, у лагерах смерці на тэрыторыі нашай краіны нацысты знішчылі звыш 1,4 млн чалавек.

Адным з найбуйнейшых лагераў смерці ў Еўропе і па тэрыторыі, і па колькасці забітых быў Трасцянец пад Мінскам, дзе было знішчана не менш за 546 тыс. чалавек.



*Яўрэі Магілёўскага гета з нагруднымі нашыўкамі ў выглядзе зоркі Давіда*

Трагічны лёс напаткаў яўрэяў. Знішчэнне нацыстамі ў гады Другой сусветнай вайны яўрэйскага насельніцтва Еўропы атрымала назву *халакост*. Яўрэйскае насельніцтва прымусова зганялі ў спецыяльныя месцы зняволення — *гета*. Гета на тэрыторыі Беларусі пачалі ствараць адразу пасля ўварвання Германіі. У Беларусі было больш за 170 гета. Найбольш вялікія — у Мінску, Гродне, Бабруйску, Баранавічах, Брэсце, Пінску, Слоніме, Гомелі. За час вайны ў гета было знішчана звыш 600 тыс. беларускіх яўрэяў.

Карныя аперацыі

Сродкам рэалізацыі палітыкі генацыду былі *карныя аперацыі*. Яны праследавалі тры асноўныя задачы: вырашэнне «партызанскага пытання»

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ




*Ваенна-адміністрацыйны падзел акупаванай тэрыторыі БССР. 1942 г.*

*Выявіце, у склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак акупанты ўключылі тэрыторыю БССР.*

(акружэнне і знішчэнне партызан, адцясненне іх ад камунікацый, «зразанне» партызанскіх зон і г. д.); рэквізіцыі і захоп сельскагаспадарчай прадукцыі, харчоў і жывёлы; захоп у палон мірнага насельніцтва для наступнай адпраўкі на прымусовыя работы ў Германію і краіны Заходняй Еўропы.

Усяго на тэрыторыі Беларусі нацысты правялі 187 карных аперацый. Іх вынікам было больш за

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

### Карныя аперацыі нацысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі

| Назва аперацыі | Тэрыторыя | Дата правядзення |
|---|---|---|
| «Балотная ліхаманка» | Брэсцкая, Віцебская, Мінская вобл. | 25 жніўня — 20 верасня 1942 г. |
| «Свята ўраджаю» | Грэскі, Капыльскі, Пухавіцкі, Слуцкі, Уздзенскі раёны | Студзень — люты 1943 г. |
| «Шаравая маланка» | Суражская партызанская зона | 14 лютага — 19 сакавіка 1943 г. |
| «Зімовае чарадзейства» | Дрысенскі, Асвейскі, Полацкі, Расонскі раёны | 14 лютага — 20 сакавіка 1943 г. |
| «Русалка» | Жыткавіцкі, Петрыкаўскі, Любанскі, Старобінскі, Капаткевіцкі раёны | 24 лютага — 1 сакавіка 1943 г. |
| «Дырлевангер» | Лагойскі, Смалявіцкі раёны | Сакавік 1943 г. |
| «Майская навальніца» | Віцебскі, Гарадоцкі, Лёзненскі, Суражскі раёны | 17–22 мая 1943 г. |
| «Паляванне на зайцоў» | Бялыніцкі, Круглянскі, Шклоўскі раёны | 14–15 кастрычніка 1943 г. |
| «Асвячэнне храма» | Васілевіцкі, Калінкавіцкі, Хойніцкі раёны | 20–21 кастрычніка 1943 г. |
| «Вясенняе свята» | Докшыцкі, Лепельскі, Полацкі, Ушацкі раёны | 17 красавіка — 5 мая 1944 г. |
| «Шпацыр на Тройцу» | Бягомльскі, Барысаўскі, Плешчаніцкі раёны | 22 красавіка — 12 мая 1944 г. |

1. *Вывучыце табліцу «Карныя аперацыі нацысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі». Знайдзіце згаданыя раёны правядзення аперацый на карце Беларусі. Як вы лічыце, чаму нацысцкія злачынцы давалі карным аперацыям такія назвы?*
2. *У вучэбным дапаможніку «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» для 10–11 класаў знайдзіце інфармацыю пра карныя аперацыі нацыстаў, іх мэты і вынікі.*



*Скульптура «Няскораны чалавек» у в. Хатынь*

12 тыс. спаленых і разбураных сельскіх населеных пунктаў. Сімвалам генацыду беларускага народа зрабілася вёска Хатынь, жыхары якой 22 сакавіка 1943 г. былі жыўцом спалены нацыстамі і ўкраінскімі калабарацыяністамі.

**5 студзеня 2022 г.** прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа», якім

прадугледжана юрыдычнае прызнанне генацыду беларускага народа і ўсталяваная крымінальная адказнасць за яго адмаўленне. Згодна з Законам пад генацыдам беларускага народа разумеюць здзейсненыя нацысцкімі злачынцамі і нацыяналістычнымі фарміраваннямі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд злачынствы, накіраваныя на планамернае знішчэнне беларускага народа шляхам забойства і іншых дзеянняў, якія прызнаюцца генацыдам у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі і нормамі міжнароднага права.

У 2022 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзень **22 чэрвеня** абвешчаны Днём усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь у красавіку 2021 г. распачала крымінальную справу па факце генацыду насельніцтва Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд.

Мэты расследавання крымінальнай справы:

- збор доказаў, што пацвярджаюць сапраўдны маштаб трагедыі, якую перажыў беларускі народ у гады акупацыі;
- устанаўленне ўсіх фактаў злачынных дзеянняў карнікаў на тэрыторыі БССР;
- прыцягненне да адказнасці нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых, што пазбеглі пакарання;
- захаванне гістарычнай памяці, кансалідацыя беларускага грамадства, выхаванне яго ў духу патрыятызму і любові да Радзімы, забеспячэнне ідэалагічнай пераемнасці пакаленняў.

З ініцыятывы Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь у маі 2021 г. прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму», накіраваны на недапушчэнне ўсіх формаў і праяў нацызму, апраўдання яго дактрыны і практыкі, гераізацыі нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых.

1. *У чым заключаецца значнасць расследавання крымінальнай справы, распачатай Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь у 2021 г., для сучасных беларусаў?*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, прывядзіце прыклады, якія паказваюць ролю Беларусі ў недапушчэнні рэабілітацыі нацызму.*

**3. Эканамічная эксплуатацыя акупаваных тэрыторый.** Эканамічная палітыка акупантаў будавалася на аснове «Дырэктывы па кіраванні эканомікай у акупаваных усходніх абласцях» і была накіраваная на эканамічнае рабаўніцтва і каланізацыю захопленых тэрыторый.

Усё насельніцтва акупаваных тэрыторый ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў у абавязковым парадку прыцягвалі да *прымусовых работ* па будаўніцтве абарончых аб'ектаў, мастоў, дарог. На фабрыках і заводах рабочыя працавалі ў прымусовым парадку праз сістэму абавязковай рэгістрацыі на біржах працы.

Беларуская вёска была абкладзена высокімі натуральнымі і грашовымі падаткамі, абавязковымі пастаўкамі сельскагаспадарчай прадукцыі. Уся зямля, інвентар і жывёла былі абвешчаныя ўласнасцю германскай дзяржавы.

Эканамічная палітыка акупантаў прадугледжвала вываз з БССР максімальнай колькасці харчоў і сыравіны. Ужо з 1942 г. акупацыйныя ўлады пачалі шырока выкарыстоўваць савецкіх ваеннапалонных у якасці рабочай сілы і *адпраўляць насельніцтва* акупаваных тэрыторый, перш за ўсё моладзь, *на прымусовыя работы ў Германію*.



*Рабочая каманда са Шталага-352 адпраўляецца на будаўніцтва дарогі. В. Масюкоўшчына (цяпер г. Мінск)*

У фашысцкае рабства было сагнана больш за 380 тыс. чалавек, сярод якіх шмат хто загінуў у выніку невыносных умоў працы, нягод і катаванняў.

Разам з эксплуатацыяй мясцовага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных акупанты вывозілі з тэрыторыі Беларусі прамысловае абсталяванне і сыравіну. Рэквізаваліся або знішчаліся таксама і культурныя каштоўнасці рэспублікі.



К. Гораў, прэзідэнт Акадэміі навук Беларускай ССР

„З прыходам у Мінск нямецкіх захопнікаў кнігасховішча з замежнай літаратурай і яўрэйскай было занятае пад склад, а кнігі выкінутыя пад лесвіцу, засыпаныя смеццем і залітыя вадой. У далейшым разгром зазнала і астатняя частка бібліятэкі...
З мікраскопаў былі павыкручваны акуляры і аб'ектывы. Лабараторыі былі ператвораны ў прыбіральні. Быў выкінуты на вуліцу архіў Акадэміі навук і спалены...
Уцякаючы з Мінска, гітлераўцы спалілі лабараторны корпус Акадэміі, галоўны корпус, лабараторны будынак батанічнага саду і 30-кватэрны дом".



Будынак Акадэміі навук БССР у гады вайны

**4. Калабарацыянізм: прычыны, формы.** У рэалізацыі палітыкі генацыду на акупаванай тэрыторыі БССР удзельнічалі нацысцкія акупацыйныя органы (часці і фарміраванні СС і СД, ахоўныя часці вермахта, Тайная палявая паліцыя, ваенная жандармерыя, органы абвера — нямецкай разведкі і контрразведкі), а таксама створаныя гітлераўцамі нацыяналістычныя фарміраванні — беларускія, літоўскія, латышскія, польскія, украінскія, прадстаўнікі якіх займалі антысавецкія пазіцыі, падзялялі ідэалогію Трэцяга рэйха.

**Выканаўцы палітыкі генацыду**

Успомніце, што такое калабарацыянізм.

Першапачаткова нацысцкае кіраўніцтва не надавала супрацоўніцтву з мясцовым насельніцтвам вялікага значэння. Аднак немагчымасць атрымаць перамогу над СССР у ходзе «маланкавай вайны»,

недахоп уласных сіл для вядзення баявых дзеянняў і барацьбы з партызанскім рухам, падтрымання дысцыпліны на акупаваных тэрыторыях паставілі на парадак дня пытанне аб выкарыстанні вайсковых фарміраванняў з мясцовага насельніцтва.

Акупацыйныя ўлады разлічвалі на падтрымку сваёй палітыкі з боку пэўнай часткі беларускага насельніцтва — перш за ўсё тых, хто быў незадаволены або пакрыўджаны савецкай уладай. З ліку такіх людзей стваралі паліцэйскія атрады, нацысцкія арганізацыі: «Беларуская народная самапомач», «Саюз беларускай моладзі» і іншыя, а таксама «дарадчыя органы кіравання» — «Беларускую раду даверу пры генеральным камісарыяце „Беларусь“» (ад 21 снежня 1943 г. — «Беларуская цэнтральная рада»).

Актыўную палітыку прыцягнення да супрацоўніцтва беларускага насельніцтва праводзіў у генеральнай акрузе «Беларусь» гаўляйтар В. Кубэ. Апору сваім намерам ён знайшоў у беларускіх нацыяналістах, якія намагаліся выкарыстаць супрацоўніцтва з акупантамі для дасягнення сваёй мэты — прыходу да ўлады і стварэння «беларускай дзяржаўнасці» на аснове фашысцкай ідэалогіі.

**Сімволіка калабарацыяністаў**

У асяродку добраахвотных памочнікаў нацысцкага рэжыму, у тым ліку ўзброеных фарміраванняў, што ўдзельнічалі ў карных аперацыях, пачалі выкарыстоўваць для абазначэння беларускай нацыянальнай прыналежнасці бела-чырвона-белую сімволіку, выявы «Пагоні».

Бела-чырвона-белы сцяг вывешвалі на мерапрыемствах з удзелам германскіх акупацыйных улад, а таксама на будынках, у якіх размяшчаліся калабарацыянісцкія структуры; ён выкарыстоўваўся практычна ўсімі памагатымі нямецкіх захопнікаў на акупаванай тэрыторыі БССР: паліцыяй, Беларускім корпусам самаабароны, Беларускай краёвай абаронай, Беларускай цэнтральнай радай і інш.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Прафесар Гарвардскага ўніверсітэта А. Далін у 1957 г. выдаў кнігу «Захопленыя тэрыторыі СССР пад кантролем нацыстаў». Паводле яго ацэнкі, у савецкай Беларусі антыкамуністычныя настроі прысутнічалі ў сялянскім асяродку і тонкай праслойцы беларускай інтэлігенцыі. Але нават сярод гэтай часткі беларускіх нацыяналістаў жаданне супрацоўнічаць з немцамі пачало знікаць, як толькі яны пачалі разумець, што нацысты ніколі не мелі мэты стварэння незалежнай Беларусі. А палітыка масавага тэрору ўвогуле прымусіла насельніцтва акупаваных тэрыторый адмовіцца ад супрацоўніцтва з нямецкімі ўладамі. Сепаратызм у Беларусі ў параўнанні з іншымі акупаванымі савецкімі рэспублікамі, асабліва з Украінай, аказаўся значна слабейшы. У выніку масавага калабарацыянізму, на які спадзяваўся Трэці рэйх, у Беларусі не здарылася.

«...некаторая частка жыхароў Беларусі аказалася ўцягнутая ў шэрагі палітычнай калабарацыі. Гэта былі людзі, якія адназначна не прымалі савецкую ўладу і свядома супрацоўнічалі з нямецкімі ўладамі, частка аказалася ўцягнутая ў супрацоўніцтва з акупантамі з прычыны маладушнасці або несвядомасці. У гэтых шэрагах знаходзіліся і асацыяльныя элементы, людзі з крымінальным мінулым, зацікаўленыя ў гвалце і атрыманні матэрыяльных даброт. Былі і тыя, хто з карыслівых мэт імкнуўся, абапіраючыся на германскія ўлады, захаваць свой уплыў і рычагі кіравання ў структуры акупацыйнага рэжыму, каб уладарыць над людзьмі. Аднак на месцах германскія акупацыйныя органы не мелі ні грамадскай падтрымкі, ні адабрэння насельніцтва. Абсалютная большасць беларускага народа ўспрымала акупацыйную ўладу як чужую, як уладу гвалту, рабаўніцтва і тэрору» (Каваленя А. А., Даніловіч В. В. і інш. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці, 2019 г. Т. 4. С. 252)

1. *Параўнайце дзве думкі вучоных наконт калабарацыянізму ў Беларусі. Што ў іх агульнага і чым яны адрозніваюцца?*
2. *Як бы вы адказалі на пытанне: чаму калабарацыянізм на акупаванай тэрыторыі Беларусі не зрабіўся масавым?*

Беларускія калабарацыяністы, паліцэйскія, якія выконвалі злачынныя загады германскіх улад, насілі на левым рукаве ўніформы бела-чырвона-белыя павязкі або шэўроны-нашыўкі ў выглядзе бела-чырвона-белага сцяжка, на галаўных уборах — бела-чырвона-белы аколышак і кукарду з «Пагоняй».

Спробы стварыць так званыя «органы самакіравання» не спыняліся на працягу ўсяго перыяду акупацыі. На месцах прызначалі бургамістраў, старастаў, іх памочнікаў, стваралі аддзелы з узброеных паліцэйскіх, якіх прыцягвалі да карных аперацый. Аднак усе намаганні акупантаў і іх прыспешнікаў не мелі таго эфекту, на які яны разлічвалі. Калабарацыянізм у Беларусі не мог адыграць істотнай ролі, якая б паспрыяла ўмацаванню пазіцый акупацыйных улад, задушэнню партызанскага руху або забеспячэнню перавагі вермахта ў баях з Чырвонай арміяй.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

• Па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ў 2023 г. была праведзена маштабная рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу «Хатынь». На яго тэрыторыі з'явіўся музей і пабудаваны праваслаўны храм.



*Музей у Хатыні*



*Праваслаўны храм*

• У лютым 2024 г. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь пачаў разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да нацысцкага карніка У. Катрука, абвінавачанага ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанага арт. 127 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (генацыд). Выяўлены 12 эпізодаў злачыннай дзейнасці калабаранта ў складзе 118-га батальёна ахоўнай паліцыі, у тым ліку яго ўдзел у знішчэнні жыхароў вёскі Хатынь.

18 сакавіка 2024 г. прысудам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь У. Катрук прызнаны вінаватым у генацыдзе беларускага народа.

1. *Назавіце дату карнай аперацыі ў вёсцы Хатынь.*
2. *У чым значнасць расследавання злачынстваў нацыстаў і калабарацыяністаў на сучасным этапе?*

*У гады Вялікай Айчыннай вайны нацысты і іх памагатыя на тэрыторыі Беларусі праводзілі паслядоўную чалавеканенавісніцкую палітыку — генацыд беларускага народа. Злачынствы нацыстаў і іх памагатых не маюць тэрміну даўніны. Рэспубліка Беларусь праводзіць мэтанакіраваную палітыку па захаванні гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
| --- | --- |
| 28 лістапада — 1 снежня 1943 г. — Тэгеранская канферэнцыя | 22 верасня 1943 г. — мінскія падпольшчыкі выканалі смяротны прысуд кіраўніку акупацыйнай адміністрацыі, ка́ту савецкага народа гаўляйтару В. Кубэ |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якое стратэгічнае значэнне мелі абарончыя баі на тэрыторыі БССР улетку 1941 г.?
2. У чым праяўлялася палітыка генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны? Канкрэтызуйце свой адказ фактамі.
3. Якія былі мэты эканамічнай палітыкі акупантаў?
4. Выказванне «Мэта апраўдвае сродкі» адны прыпісваюць езуітам, іншыя — італьянскаму мысляру Н. Мак’явелі. Паразважайце, ці можна пагадзіцца з гэтым меркаваннем на прыкладзе дзейнасці беларускіх нацыяналістаў на акупаванай нацыстамі тэрыторыі Беларусі.
5. Чаму важна захоўваць гістарычную памяць аб подзвігу і трагедыі беларускага народа ўгады Вялікай Айчыннай вайны?